Фёдар Гурыновіч

# Паляўнічая паэма



Мінск
Выдавецтва «Чатыры чвэрці»
2023

УДК 821.161.1(476)-3
ББК 84(4Беи=Рус)6-44
Г95

*Аўтар і выдавецтва шчыра ўдзячныя Генеральнаму дырэктару ААТ «Беларуськалій» Івану Іванавічу Галаватаму, Генеральнаму дырэктару ААТ «Трэст Шахтаспецбуд» Дзянісу Аляксандравічу Дзіуліну, старшыні рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Ігару Анатольевічу Шуневічу за садзейнічанне ў выданні кнігі.*

**Гурыновіч, Ф. Ф.**
Г95 Паляўнічая паэма / Фёдар Гурыновіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2023. — 188 с. : іл.
ISBN 978-985-581-596-0.

Можна ўпэўнена сцвярджаць, што да гэтага часу ні ў рускай, ні ў беларускай паэзіі, акрамя «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага, падобнага твора не было. Новая паэма Фёдара Гурыновіча, напісаная на дзвюх мовах, — гэта гімн не толькі паляванню, але і нашай беларускай прыродзе.

Нагадаем, што больш за 55 гадоў прайшло з таго часу, калі аўтара паэмы прынялі ў Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў, да таго ж ён ганаровы сябра гэтага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання. Паляванне і любоў да прыроды — ці ж не парадокс? Менавіта пра тое, што ніхто, як паляўнічы, так не любіць і не беражэ прыроду, расказвае творца ў сваёй новай кнізе «Паляўнічая паэма». Напоўненая яркімі вобразамі, вясёлкавымі колерамі ўсіх пор года, галасамі звяроў і птушак, яна чытаецца на адным дыханні і нікога не пакіне раўнадушным.

Кніга Фёдара Гурыновіча, аформленая цудоўнымі акварэлямі, — выдатны падарунак не толькі паляўнічым, але і ўсім аматарам прыроды.

**УДК 821.161.1(476)-3**
**ББК 84(4Беи=Рус)6-44**

**ISBN 978-985-581-596-0**

© Гурыновіч Ф. Ф., 2023
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2023

# ПАЛЯЎНІЧАЯ ПАЭМА

Охота — это вовсе не охота,
А что — я сам не знаю. Это что-то,
Чего не можем сами мы постичь,
И, сколько бы мы книжек ни вкусили, —
Во всей его мятущести и силе
Зовёт нас предков первобытный клич.

*Евгений Евтушенко*

Так было на веках, с этого началось:
само же страстное чувство природы требует
поймать бегущего зверя, метким выстрелом
остановить летящую птицу. И после самому,
своей собственной рукой, поднять, подержать.

*Михаил Пришвин*

Мой верны сябар, дарагі чытач мой,
Не ведаю, ты пажылы ці юны,
І толькі ў тым упэўнены бясспрэчна,
Што паляўнічы ты, як я і сам.

Чакаеш з нецярпеннем ты парошу,
Каб пахадзіць па зайчыкавым следзе.
Калі ж палі ватоўку снегу скінуць,
Хвалюешся, чакаючы гусей.

О, як іх дружны гогат слых твой лашчыць,
І колькі дзіўнай музыкі ў іх крыках!
Яны на дол абрушваюць нябёсы
І прымушаюць сэрца заміраць.

Ты ў поўнач прачынаешся вясною,
Каб выбрацца на ток цецеруковы.
І, скурчыўшыся ў схове цеснаватым,
Выслухваеш густую цішыню.

Хвасціска белай ружай распусціўшы,
Свіціцца такавік, як чорны месяц,
І булькае ў гарляк ручвом вясняным,
Чаруючы зыходзячую ноч.

Калі ж заранка праз галлё зайграе,
Як бровы ў касача, вуголлем зыркім,
Ты тайну неспазнаную спасцігнеш,
Адмовіўшыся песню абарваць.



Ты, вытанчанай лотаццю скароны,
Што сонейкам лагчыну саграваe,
Спяшаешся за горад адвячоркам,
Дзе спеліць россып коцікаў вярба.

Любуючыся захадам барвяным,
Глытаючы пах прэлі, і свабоды,
І зеляніны першай, аксамітнай,
На цязе слонак чуйна ты стаіш.

Калыша выстрал бэзавую дымку.
Ты слонку, што наперакос упала,
Шукаеш доўга ў леташняй лістоце.
Яна ж захрасла ў вецці на вярбе.

Ты знімеш за пластмасавую дзюбку
Яе, нібы жар-птушку, – залатую,
Разгладзіўшы памятыя пярынкі,
І пакладзеш ашчадна ў свой рукзак.

Табе трафей патрэбны, несумненна,
Каб даказаць сябрам, знаёмым, блізкім,
Што прама за ваколіцаю нашай
Існуе чарадзейны, мудры свет.

На плёс начны бабры там выплываюць
З хвастамі, нібы ў казачных русалак,
І папараць у пушчы зацвітае,
Хоць, кажуць, не цвіце яна зусім.

Там зубр магутны з вёснаў старажытных
Па верасе спружыністым блукае
І барадой, мяцелістай, густою,
Змятае хвою з векавых сцяжын.

Трафей — ён для таго яшчэ патрэбны,
Каб даказаць і невуку любому,
Што так ніхто не беражэ прыроду,
Як паляўнічы.
Ці ж не парадокс?

Магчыма, ды вялікія — Аксакаў,
Талстой, Някрасаў, Прышвін і Тургенеў —
Занятак захапляльны той апелі
У творах, што й цяпер кранаюць нас.

Пісалі пра яго Купрын і Бунін,
Біянкі, Сабанееў, і Астаф'еў,
І Сакалоў-Мікітаў, і Чаркасаў,
Арсеньеў, Фет і Мамін-Сібірак.

Магу дзясяткі я назваць вучоных,
Палітыкаў, паэтаў, жывапісцаў,
Даследчыкаў — людзей вядомых самых,
Хто паляваннем змалку даражыў.

Не знаю, праўда, павядзе куды ён,
Мой гэты сказ, напісаны верлібрам,
Паколькі ўспомніць не магу, калі я
Сур'ёзна паляваннем захварэў?

І колькі мне было на самай справе,
Калі я ў першы раз узяў у рукі
Бацькоўскую пашарпаную тулку
З пабітым ржой уедлівай ствалом?

Здаецца, я вучыўся ў сёмым класе,
І тата ўзяў мяне на паляванне.
І ўбачыў я, як пасля стрэлу качка
Упала на іскрыстую ваду.